Актуальна

# ВЫКЛЮЧЫЦЬ КАРНЫ ЎХІЛ

## У Адміністрацыі Прэзідэнта абмеркавалі ўдасканаленне адміністрацыйнай адказнасці

**Пасяджэнне адбылося ў працяг нарады ў Прэзідэнта па пытаннях ужывання мер адміністрацыйнай адказнасці. Згодна з пратаколам даручэнняў, дадзеных па выніках праведзенай 16 снежня нарады, усім ведамствам, упаўнаважаным на вядзенне адміністрацыйнага працэсу, неабходна выключыць выкарыстанне фармальных статыстычных паказчыкаў. Складанне пратаколаў дзеля выканання плана і атрымання прэміі недапушчальнае. Гэта нагадаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА, які правёў пасяджэнне міжведамаснай экспертнай групы па ўдасканаленні заканадаўства ў гэтай галіне.**

У тым ліку кіраўнік дзяржавы даў даручэнне ўраду тэрмінова забяспечыць ацэнку і прыняцце мер па павелічэнні хуткаснага рэжыму і аптымізаваць выкарыстанне сістэм фотафіксацыі на дарогах агульнага прызначэння. Гэтая работа ўжо пачатая.


Фота БелТА.

«Зразумела, што тут трэба падыходзіць аб'ектыўна і пісьменна, не павінна быць перакосаў у пытаннях бяспекі. Але калі затрачаны велізарныя фінансавыя сродкі на будаўніцтва дарог і мы бачым тыя ж хуткасныя рэжымы, то ўзнікае справядлівае пытанне, для чаго гэта ўсё рабілася і як эксплуатуецца», — заўважыў кіраўнік Адміністрацыі.

Адна з асноўных задач — прынцыпова перагледзець заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці, выключыўшы карны ўхіл, і ўзмацніць прафілактычную накіраванасць. На нарадзе ў Прэзідэнта гаворка ішла аб падрыхтоўцы прынцыпова новых, а галоўнае — стабільных кодэксаў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

«Гэтыя дакументы павінны быць простымі і зразумелымі для ўспрымання службовымі асобамі, якія вядуць адміністрацыйны працэс. Сэнс прававых прадпісанняў павінен быць зразумелы грамадзянам і прадстаўнікам дзелавой супольнасці. Забароны і абмежаванні павінны заставацца толькі там, дзе яны аб'ектыўна апраўданы, — там, дзе ёсць рызыка прычынення шкоды жыццю і здароўю людзей», — удакладніў Ігар Сергеенка.

На нарадзе Прэзідэнт паставіў задачу скараціць колькасць дзяржорганаў, упаўнаважаных на складанне пратаколаў і разгляд спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Ігар Сергеенка адзначыў, што да 1 чэрвеня 2020 года неабходна выйсці на канкрэтны вынікі, арыенціровачна да 1 сакавіка падрыхтаваць канцэпцыю законапраектаў, а да 1 мая — самі праекты.

Нацыянальны Цэнтр прававой інфармацыі да 24 студзеня 2020 года збірае пажаданні па пытаннях існуючай практыкі і прапановы па ўдасканаленні мер адміністрацыйнай адказнасці. Сабраныя матэрыялы будуць прааналізаваны і выкарыстаны пры падрыхтоўцы новага заканадаўчага акта.

Некаторыя санкцыі новага КаАП могуць стаць мякчэйшымі, а асобныя правапарушэнні палічацца нязначнымі і пазбавяцца падстаў для прыцягнення да адказнасці. Такая норма ёсць і сёння, але яна працуе не зусім добра, адзначае БелТА. Эксперты лічаць, што адміністрацыйны працэс павінен быць больш хуткім і не павінен выклікаць цяжкасцяў. Акрамя таго, у асобным раздзеле кодэкса хочуць абагуліць работу, звязаную з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў фіксацыі правапарушэнняў.

Грошы

# З 1 студзеня «старыя» на «новыя» — толькі ў Нацбанку

**Прэс-служба Нацыянальнага банка краіны нагадвае, што 31 снежня гэтага года заканчваецца перыяд, калі грашовыя знакі ўзору 2000 года можна абмяняць на грошы ўзору 2009 года ў банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях.**

З першых дзён новага года да 31 снежня 2021 года ўключна «старыя» грашовыя знакі можна будзе абмяняць на «новыя» толькі ў Нацыянальным банку Беларусі па адрасе: горад Мінск, вул. Талстога, дом 6. Абмен ажыццяўляецца без абмежаванняў і спагнання камісійнага ўзнагароджання.

А вось з 1 студзеня 2022 года грашовыя знакі ўзору 2000 года стануць несапраўдныя.

Колькі грошай не памянялі? Так, частку купюр (як правіла, дробных наміналаў) насельніцтва пакінула сабе на памяць. Па стане на пачатак снежня з абарачэння канфіскавана 98 % ад сумы грашовай наяўнасці «старога» ўзору і 60,6 працэнта ад колькасці банкнот, якія знаходзіліся ў абарачэнні на 1 ліпеня 2016 года. Банкноты буйных наміналаў (50 000, 100 000, 200 000 рублёў) канфіскаваныя з абарачэння практычна цалкам — больш за 99 % ад агульнай колькасці, узровень канфіскацыі банкнотаў сярэдніх наміналаў (5 000, 10 000 і 20 000 рублёў) склаў 75,5 %. Таксама выведзена з абарачэння 39,8 % банкнотаў дробных наміналаў (100, 500 і 1000 рублёў).

Варта нагадаць, што дэнамінацыя афіцыйнай грашовай адзінкі — беларускага рубля — праведзеная 1 ліпеня 2016 года. З гэтай даты ў абарачэнне выпушчаны сем наміналаў новых банкнотаў узору 2009 года — 5, 10, 20, 50, 100, 200 і 500 рублёў і восем наміналаў манет — 1, 2, 5, 10, 20 і 50 капеек, а таксама 1 і 2 рублі. Банкноты ўзору 2000 года абменьваліся на банкноты і манеты ўзору 2009 года ў суадносінах 10 000 да 1.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Да ведама

# Цяжкія пасылкі з-за мяжы стануць больш даступныя

**З 1 студзеня зменяцца правілы ўвозу і перасылкі тавараў з-за мяжы. Змены закрануць непадзельныя тавары вагой больш за 35 кілаграмаў. Цяпер за іх трэба плаціць мытную пошліну з усяго кошту тавару, а з 2020 года мы будзем кампенсаваць толькі перавышэнне лімітаў па вазе або кошце. Такім чынам, увозіць цяжкія тавары стане больш выгадна.**

Што датычыцца пасылак з-за мяжы, то мытная пошліна за іх пераважку паменшыцца ўдвая — да 15 % з перавышэння вартаснай або вагавой нормаў (але не менш як 2 еўра за 1 кілаграм вагі).

Дарэчы, з гэтай жа даты айчынная пошта пачне спаганяць камісію за плацяжы праз АРІП. Тарыф такой камісіі за правядзенне плацяжу — 60 капеек. Разам з тым плацяжы наяўнымі або карткай праз плацежна-даведачныя тэрміналы падлягаць камісіі не будуць. Яе таксама не будуць браць з удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, за плацяжы ў бюджэт, на дабрачынныя рахункі, на карысць пастаўшчыкоў асноўных і дадатковых камунальных паслуг. Акрамя таго, без камісіі будуць праходзіць плацяжы на карысць «Белтэлекама» за тэлефон і тэлефонны сэрвіс інтэлектуальнай сеткі, а таксама на карысць самой «Белпошты».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Факт

## У Мінску вырас кошт праезду

**Новыя тарыфы на праезд у гарадскім і прыгарадным пасажырскім транспарце Мінска пачалі дзейнічаць 26 снежня.**

Так, па інфармацыі прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь», разавыя паездкі ў метро і наземным транспарце падаражэлі на 5 капеек. Цана за праезд у прыгарадных аўтобусах павялічылася на 2 капейкі за адзін кіламетр. З 26 снежня за адну паездку ў наземным гарадскім грамадскім транспарце трэба будзе заплаціць 65 капеек (раней 60). Пры продажы кіроўцам — 70 капеек, у аўтобусах экспрэсных маршрутаў — 80 і 85 адпаведна, паездка ў метро абыдзецца ў 70 капеек (раней 65).

Павышэнне тарыфаў адбылася і на кошце праязных: напрыклад, безлімітны білет на 30 сутак на два віды транспарту (аўтобус-метро, тралейбус-метро, трамвай-метро) з 26 снежня каштуе 39,03 рубля (раней 37,54 рубля). Квіткі на адну паездку, набытыя па ранейшых тарыфах, дзейнічаюць на працягу 30 сутак з дня ўступлення ў сілу новых.

Апошні раз тарыфы на праезд у гарадскім пасажырскім транспарце Мінска павялічваліся з 1 лістапада 2017 года, а ў прыгарадным — у снежні 2016 года.

## Зрабіў сабе «падарункі» да свят

**У Мінску на пульт Фрунзенскага аддзела Дэпартамента аховы паступіў сігнал аб спрацоўванні сігналізацыі ў краме па вуліцы Прытыцкага. Нарад затрымаў 41-гадовага гараджаніна.**

Падчас агляду ў сумцы ў мужчыны знайшлі 16 батонаў каўбасы, якія ён пранёс міма кас, а ў кішэні — ключ ад камеры захоўвання крамы. У ячэйцы міліцыянеры выявілі 11 бляшанак і два пакеты кавы. Запісы з камер відэаназірання паказалі, што каву мужчына вынес з гандлёвай залы першай партыяй, а затым вярнуўся па каўбасу. Скрадзены тавар ацанілі ў 370 рублёў. Затрыманы растлумачыў, што пражывае побач і такім спосабам спрабаваў зладзіць сабе падарунак да навагодніх свят.

## Прыгожае жыццё за цётчыну валюту

**Аператыўнікі Савецкага РУУС сталіцы затрымалі 22-гадовую мінчанку, якая выкрала ў сваёй сваячкі 16 000 долараў, 8890 еўра і іншую валюту.**

З заявай у міліцыю звярнулася 39-гадовая гараджанка, якая растлумачыла, што з яе кватэры знікла буйная сума грошай. Праваахоўнікі ўстанавілі, што датычнай да крадзяжу грошай аказалася пляменніца заяўніцы — 22-гадовая жыхарка сталіцы. Аператыўнікам дзяўчына расказала, што пачула размову маці і цёткі, з якой яна зразумела, што ў сястры маці маецца буйная сума грошай, якую тая планавала выдаткаваць на куплю кватэры. Выкраўшы адзін з камплектаў ключоў ад кватэры сваячкі, дзяўчына дачакалася моманту, калі дома нікога не будзе, пранікла ў жыллё і выкрала каля 3800 рублёў. Крадзяжы яна здзяйсняла яшчэ на працягу дзесяці месяцаў. Выкрадзеныя дзяўчына выдаткавала на набыццё дарагой тэхнікі і паездкі за мяжу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пасля Brexit Брытанію неўзабаве чакаюць у Еўрасаюз



Вялікабрытанію запрасілі вярнуцца назад у Еўрасаюз пасля Brexit, расказаў намеснік старшыні Еўракамісіі Урсулы фон дэр Ляен Франс Цімерманс, перадае The Guardian. У сваім лісце брытанскаму народу ён адзначыў, што адчувае сябе «старым кінутым палюбоўнікам» з-за намеру Лондана выйсці з Еўрасаюза. Цімерманс дадаў, што «сямейныя повязі» ніколі не будуць разарваныя: на яго думку, Вялікабрытанія ўсё роўна застанецца часткай Еўропы. Палітык падкрэсліў, што паважае і нават любіць каралеўства, аднак лічыць, што яно занадта канцэнтруецца на сваіх адрозненнях ад еўрапейскага кантынента.

20 снежня палата абшчын брытанскага парламента ўхваліла законапраект аб выхадзе Вялікабрытаніі са складу Еўрасаюза. Калі ў найбліжэйшыя тыдні ён будзе ўзгоднены абедзвюма палатамі і падпісаны каралевай Лізаветай II, краіна пакіне ЕС ва ўстаноўлены тэрмін — да 31 студзеня 2020 года.

### У ЗША рыхтуюцца да кібервайны супраць Расіі

Камандаванне войскамі кібернетычнай абароны Узброеных сіл ЗША распрацоўвае тактыку вядзення інфармацыйнай вайны супраць Расіі, піша The Washington Post. Газета высветліла, што амерыканскія ваенныя заняліся падрыхтоўкай да разгортвання кібераперацый супраць вышэйшых расійскіх службовых асоб і бізнесменаў. Загад аб пачатку атакі можа быць дадзены, «калі Масква паспрабуе ўмяшацца ў выбары ў ЗША ў 2020 годзе, узламаўшы выбарчыя сістэмы або пасеяўшы варожасць» сярод выбаршчыкаў. Суразмоўнікі выдання удакладняюць, што наўрад ці мэтай для нападзення стане расійскі лідар Уладзімір Пуцін. У гэтым выпадку, сцвярджаюць яны, Масква палічыць дзеянні ЗША занадта правакацыйнымі.

### У Швецыі да пенсіянераў падселяць мігрантаў



Да пенсіянераў Швецыі будуць падсяляць маладых мігрантаў у рамках праграмы інтэграцыі замежнікаў, паведамляе Deutsche Welle. Аўтары праекта SallBo заяўляюць, што ён дапаможа пажылым людзям пазбавіцца ад пачуцця адзіноты, а мігрантам — прывыкнуць да новай краіны. Праграма будзе праходзіць у шведскім горадзе Хельсінгборгу ў спецыяльных інтэрнатах. 31 кватэру выдзеляць для пенсіянераў, яшчэ 20 — для мігрантаў узростам ад 18 да 25 гадоў. Палова кватэр прызначана для прыезджых, якія жывуць з дзецьмі.

«Падобны спосаб рассялення яшчэ не практыкаваўся ні ў адной краіне свету», — падкрэсліваюць аўтары праекта. Яны адзначаюць, што частка мігрантаў у Швецыі нават не кантактуюць з дарослымі і пажылымі мясцовымі жыхарамі. Лічыцца, што сумеснае пражыванне дапаможа прыезджым лепш разумець шведскае грамадства.